П а с т с к р ы п т у м. Управа Сойму БНФ зьвяртае ўвагу групаў падтрымкі і радаў, што пісьмовыя звароты ў Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР, якія датычаць пытаньняў, вынесеных у парадак дня бліжэйшай сесіі (гл. "Вячэрні Мінск", 30 чэрвеня 1989) зьяўляюцца афіцыйнымі дакументамі і ўлічваюцца пры вырашэньні адпаведных пытаньняў.

У нас засталося зусім небагата часу. Таму раім пасьпяшацца зь лістамі і зваротамі. На адрас Прэзідыума іх трэба накіроўваць т э р м і н о в а.

С.Паўлоўскі

## "ЛОЖЬ И ДЕЗИНФОРМАЦИЯ"

Менавіта так назваў свой допіс у міліцэйскую газету "На страже Октября" (30 чэрвеня) нехта М.Харытонаў. Цытую: "Позняк лжет уже в который раз". Што тут маецца на ўвазе? Відаць, артыкулы З.Пазьняка, у якіх ён паведаміў пра Курапаты, пра зьнішчэньне роднае мовы, духоўнасьці на Беларусі, ягоная крытыка цяперашнік кіраўнікоў Рэспублікі. Названы допіс датычыцца інтэрв'ю З.Пазьняка радыёстанцыі "Свабода", якое ён даў пад час Устаноўчага зьезду БНФ у Вільні. Што ж там "налгал" З.Пазьняк радыё "Свабода"? Пра павышаную гатоўнасьць мінскае міліцыі напярэдадні Зьезду? Напэўна, калі б гэта было ня так, "На страже Октября" спасылалася б на факты, а не абмяжавалася зьневажальным "беспардонный треп", "ретивые борзописцы", "лить грязь на родную сторонку из-за границы", "ложь на экспорт", "продукт с душком", "болтовня" и т.д. Але факты прымяненьня ўзброенай сілы 30 кастрычніка 1988 супраць мірнага насельніцтва, выкраданьне са ўзломам літаратуры БНФ з Дому літаратараў, зьбіцьцё міліцыяй сябра Аргкамітэту С.Сьвістуновіча ў прысутнасьці пракурора г.Баранавічы сьведчаць пра іншае. Вядома, што ў вечары 25 чэрвеня нарады міліцыі пад Менскам спынялі машыны дэлегатаў і гасьцей Зьезду БНФ. Адсылаю калегу зь міліцэйскай газеты да адпаведных пратаколаў і сьведкаў.

Аўтар рэплікі абураецца адносна таго, што заявы З.Пазьняка аб "штрафаваных" за нашэньне сімволікі ня маюць падстваў. Маўляў, назавіце прозьвішча. Калі ласка! У Сьветлагорску штрафавалі М.Бусел, у Полацку -- І.Мурашка, у Маладэчанскі РАУС прыцягнуты А.Капуцкі... І гэта можна, калі не паленавацца, праверыць па пратаколах.

Далей М.Харытонаў пераходзіць да нацыянальнай сімволікі: "То, что бело-красно-белый цвет республики отнюдь не национальный, а националистический с коричневым оттенком, уже давно доказано и нет нужды на этом останавливацца. Вспомним: Белорусь синеокая..." Ведаеце, пасьля Чарнобыля, пасьля "хімікаў", пасьля татальнага асушэньня рэк -- у выніку ўсёй той палітыкі, "на страже" якой апынулася наша міліцэйская газета, -- не такая ўжо Беларусь і сінявокая. Ці можа і гэта -- "ложь"?

---

Нумар падрыхтавалі Алесь Суша, Сяргей Дубавец, Павел Жук. Адрас для карэспандэнцыі: 220113, Менск-113, абанементная скрыня 327. Нагадваем, што без Вашых ахвяраваньняў выданьне бюлетэня стане немагчымым.



# НАВІНЫ

БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ ЗА ПЕРАБУДОВУ "АДРАДЖЭНЬНЕ"
8 1989. 17 ліпеня.

---

- ДА СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР
- 26 ЛІПЕНЯ -- МІТЫНГ У МЕНСКУ
- САЎМІН РАЗБУРАЕ ПОМНІК ГІСТОРЫІ
- ПАЗАЧАРГОВЫ ЗЬЕЗД КПБ
- ГАЛАДОЎКА У БЕРАСЬЦІ
- "ЛОЖЬ И ДЕЗИНФОРМАЦИЯ"

## ХРОНІКА

14 л і п е н я. Сябры Сойму БНФ Кастусь Лапко і Віктар Іванкевіч і віцэ-прэзідэнт Беларускага экалагічнага саюзу Лявон Тарасенка накіравалі старшыні Менгарвыканкаму Ул.Міхасёву заяву:

26 ліпеня 1989 Беларускі Народны Фронт за перабудову Адраджэньне мяркуе правесьці агульнагарадскі мітынг жыхароў Менска на тэму: "Праблемы экалогіі на Беларусі і выжываньне народу".

Месца правядзеньня мітынгу -- плошча Леніна. Час правядзеньня: з 19.30 да 23.00. Прыблізная колькасьць удзельнікаў -- 25 тысяч чалавек. Просім санкцыянаваць правядзеньне мітынгу.

Б а н ц а р а ў ш ч ы н а. Унікальны помнік беларускай гісторыі -- гарадзішча Банцараўшчына пад Менскам -- ператвораны ў будаўнічую пляцоўку. Тут паўстануць дачы Саўміна і Міністэрства ўнутраных справаў БССР. Гэтае санкцыянаванае злачынства (арт. 225 Крымінальнага кодэксу БССР) -- новая акцыя супраць гістарычнае памяці і культуры нашага народу з маўклівай згоды пракурора Рэспублікі -- яшчэ адзін факт чыноўніцкага самаўпраўства (арт. 196 КК БССР).

5 л і п е н я. У Наваполацку адбыўся мітынг, скліканы гарадской Радай БНФ і мясцовымі суполкамі "зялёных". Сябры Сойму "Адраджэньня" Сяржук Сокалаў-Воюш (Наваполацак) і Мікола Купава (Менск) распавялі пра Устаноўчы зьезд Фронту, адказалі на пытаньні пра канкрэтныя мэты і задачы адраджэнскага руху. Старшыня Наваполацкай Рады БНФ Анатоль Кулік гаварыў пра накіраваную на стрымліваньне палітычнай актыўнасьці наваполачанаў дзейнасьць гарадскіх уладаў. У мітынгу ўзяў удзел народны дэпутат СССР, сакратар ЦК КПБ М.Дзямянцей. Падвесьці высновы да больш чым паўгадзіннай гаворкі паспрабаваў народны дэпутат СССР, член ЦК КПСС, першы сакратар Віцебскага абкама КПБ Ул.Грыгор'еў. Ён пачаў свой выступ з абразаў. У прыватнасьці, назваўшы змагароў за беларускую мову "фарысеямі" (праўда, пасьля пратэстаў удзельнікаў мітынгу вымушаны быў па-



Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/11 sprava 415

